*Т.А. Прохарцава,*
*аспірант кафедры народнага*
*дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# УВАСАБЛЕННЕ ФАЛЬКЛОРНЫХ МАТЫВАЎ У БЕЛАРУСКАЙ КНІЖНАЙ ГРАФІЦЫ 1960–1970-х гадоў (на прыкладзе мастацкага афармлення дзіцячай кнігі)

У кантэксце ўзрослага значэння нацыянальных школ у мастацтве атрымліваюць распаўсюджанне пластычныя і колеравыя прыёмы народнай творчасці як духоўнай крыніцы. Мастакі-графікі, адначасова з мастакамі іншых відаў выяўленчага мастацтва, збіраюць і выкарыстоўваюць у сваёй творчасці фальклорныя здабыткі, узбагачаюць і пашыраюць творчыя пошукі. У кніжнай графіцы ў 1960–70-я гг. найлепш прадстаўлены такі напрамак, як мастацтва дзіцячай кнігі. Народныя казкі, прыпеўкі, пацешкі, выдадзеныя ў гэты перыяд, аздабляліся ілюстрацыямі айчынных графікаў, для якіх характэрны маляўнічасць, але разам з тым колеравая і графічная стрыманасць, абагульненасць і манументальнасць форм: «Скарб» (1965) А. Лось і Г. Якубені, «За ельнічкам, за бярэзнічкам» (1969) А. Лось, «Беларускія народныя казкі» (1969), «Залатая яблынька» (1969) Н. Паплаўскай, «Ладачкі-ладкі» (1977) У. Басалыгі, Н. Паплаўскай і А. Лось.

Пры афармленні дзіцячай кнігі перад мастаком паўстаюць важныя і складаныя задачы: па-першае, вырашыць пытанне назіральнасці (як вядома, адзін з важных прынцыпаў педагогікі – прынцып назіральнасці), па-другое, выканаць выхаваўчую задачу, бо праз кнігу дзеці ўзбагачаюць свой эмацыйны вопыт, набываюць уяўленні аб навакольным свеце, развіваюць мастацкі густ і эстэтычную культуру. Зыходзячы з вышэйназваных задач, відавочна, што афармленне дзіцячай кнігі патрабуе ад мастака пэўнага разумення дзіцячай псіхалогіі і мыслення, мастацкай вынаходлівасці, творчай непаўторнасці і разнастайнасці, смелых кампазіцыйных рашэнняў. Маляўнічасць, багатая вобразнасць, дэталёвая насычанасць – адметныя рысы мастацкага афармлення дзіцячай кнігі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Назапашаныя стагоддзямі народная мудрасць, аптымізм, дабрыня, шчырасць беларускіх казак вабяць Алену Лось і Наталлю Паплаўскую. Мастачкі працуюць над аднымі і тымі ж задачамі, але вырашаюць іх па-рознаму. У ілюстрацыях, створаных А. Лось, адчуваецца ўплыў літоўскіх мастакоў (падчас вучобы ў Вільнюсе ў мастачкі была магчымасць блізка пазнаёміцца з іх творчасцю), кніжнай мініяцюры, творчасці полх-майданскіх народных творцаў (матэрыял народных роспісаў быў атрыманы ў Ніжагародскім рэгіёне). У гэты ж час мастачка пачынае сваю экспедыцыю па Палессі: занатоўвае народную арнаментыку (беларуская вышыўка і ткацтва), традыцыйную цацку (гліняную і драўляную), маляваныя дываны і выцінанкі. Лінарыт, малюнкі тэмперай, гуашшу – А. Лось стварае свой аўтарскі непаўторны стыль, звяртаецца да матэрыялаў, нетрадыцыйных для графікі. «Лубачнасць», манера выканання дэкаратыўных элементаў накшталт роспісу па дрэве (раслінныя матывы), арнаментыка, блізкая па стылістыцы да разьбы, вылучаюць работы А. Лось з шэрагу прац калег па творчым цэху. Выкарыстанне ў лінарытах белага штрыха, сілуэтнае рашэнне фігур, увядзенне колеру (гуаш) набліжаюць графічныя лісты да народнай выцінанкі («Скарб», 1965). Аднак у стылістычным рашэнні шэрагу крыху пазнейшых ілюстрацый («Залатая яблынька», 1974; «Ладачкі-ладкі», 1977; «Скарб», 1975) мастачка робіць шмат паўтораў, адмаўляецца ад выкарыстання традыцыйна беларускіх матываў, з-за чаго узгаданыя ілюстрацыі да беларускіх народных казак амаль не адрозніваюцца ў мастацкім плане ад яе графічных лістоў да паэмы А. С. Пушкіна «Руслан і Людміла».

Наталля Паплаўская адна з першых звяртаецца да народнай тэматыкі: за ілюстрацыі да «Дзесяці беларускіх казак» у 1969 г. яна атрымала прэмію Францыска Скарыны. Фальклорна-этнаграфічная спадчына Беларусі арганічна ўвасобілася ў творчасці мастачкі. Ілюстрацыі да беларускіх казак выкананы ў асноўным у тэхніцы афорта, літаграфіі і акварэлі. Створаныя напрыканцы 1960-х, яны адрозніваюцца ад больш позніх абагульненнем вобраза, метафарычнасцю і алегарычнасцю. Для ілюстрацый 1970-х характэрна дэкаратыўнасць, насычанасць дэталямі, манернасць. Пры параўнанні ілюстрацыі да беларускай народнай казкі «Дзіва» (1969 г.) і беларускіх казак «Танец», «Дзядок» (1975) заўважна розніца ў падыходах да рашэння вобраза герояў. У першым выпадку перад гледачом паўстае завершаны казачны вобраз гераіні, дапоўнены выявамі птушкі і дрэва на заднім плане. Разнастайнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

танальнага рашэння кожнай часткі кампазіцыі – светлая фігура бабкі і чорная постаць птушкі, дрэва, арнамент на рукавах кашулі, цёмны абрыс спадніцы, што выдзяляе фігуру – кампазіцыя ўяўляецца цэласнай, дасканалай і можа быць самастойным творам. У ілюстрацыях да зборніка «Ладачкі-ладкі» і казак «Танец», «Дзядок» адчуваецца канкрэтызацыя вобразаў, следаванне тэксту. Безумоўна, афармленне кнігі можа ісці і гэткім шляхам, аднак ён пазбаўляе мастака пэўнай творчай свабоды, з-за чаго ілюстрацыі бракуе самастойнасці як графічнага твора.

Такім чынам, у 1960–70-я гг. у беларускай графіцы інтэнсіўна развіваецца мастацтва дзіцячай кнігі. Маляўнічасць, багатая вобразнасць, дэталёвая насычанасць – адметныя рысы мастацкага афармлення дзіцячай кнігі такімі беларускімі графікамі, як А. Лось і Н. Паплаўская.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ